Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem

НАША ВОЛЯ

БЕЛАРУСКІ НЕЗАЛЕЖНЫ ДВУТЫДНЁВЫ ЧАСАПІС

Цана 15 гр.

Рэдакцыя і Адміністрацыя: Вільня, Домінікanская 17-12

Рэдакцыя прыймае: ад гадзіны 12 — 16
Рэдактар: ад 14—16

Падпісная плата: у год 3 зл. за паў году 1,50 злот. квартальна 1 зл.

№ 8 (9) | Вільня, 16 чэрвеня 1936 г. | Год I

„Прачытайце... і будзе ясна".

Так адказаў рэдактар „Бел. Крыніцы" на наша пытаньне, у чым выяўляецца дэструкцыйная работа „Н. Волі". Дзеля таго, каб было ясна ня толькі нам, але трохі і для „Б. Крыніцы", паслухаем добрай рады. Чытаем уважна і выпісваем асноўныя думкі.

... „Арганізацыя ўсіх жывых здаровых сіл, адданых сацыяльным і нацыянальным ідэям народным"... „паставіць рух на выразную сапраўды народную аснову, выдзяліць з яго радоў сапраўдных кіраўнікоў народу"... Здаецца не патрэбна камэнтарыяў. Гэта заданьні, якія хвалююць і якія мусяць глыбака закрануць кожнага чэснага беларуса-селяніна, работніка, інтэлігэнта, — людзей, якія шчыра змагаюцца за вызвольныя ідэалы свайго народу. Але дзе ж тут разьбіваньне? Ці-ж не ясна кожнаму, што вастрыё гэтых цытат, як і ўсяго артыкулу накіравана не на разьбіцьцё, а на сцэмэнтаваньне ўсіх здаровых і паступовых сіл народных на вызвольнай дарозе сацыяльнай і нацыянальнай барацьбы? Ці-ж можна запярэчыць таму, што нарастаючы веснаход барацьбы Беларускага Народу „людзі" з нашай-жа беларускай нацыі стараюцца адвясьці і направіць увесь гэты рух па антынароднай, рэакцыйнай дарозе. Прышчэпліваньне нашаму народу гітлероўскага фашызму праз „Новы Шлях", каторы вітае фашыстоўскія сьцягі, адзнакі і правадыра, што іх стварыў' упаіваньне зьвярынага шовінізму гэтай жа газэтай, нападаючай на ўсякую паступовую думку, атручваньне антысэмітызмам, падрыхтоўка з беларусаў пагромшчыкаў і нявольніцкае поўзаньне на каленях перад *сільнымі* гэтага сьвету, як гэта робяць некаторыя правадыры, і каб за імі ішоў наш народ, — вось тыя чорныя дарогі, па якіх хочуць яны направіць наш рух.

Мы хочам бачыць *свой народ вольным, роўным з іншымі народамі, культурным і шчасьлівым* і дзеля гэтага заклікаем на тую цярністую, але адзіную правільную дарогу, па каторай ідзе народ да поўнай нацыянальнай і сацыяльнай *незалежнасьці*.

І дзеля гэтага пісалі мы, „што рост і размах гэтага гістарычнага працэсу будзе адзначацца шляхамі, па якім пойдзе рух, і кіраўніцтвам, якое стане на чале яго". Што-ж тут не яснага? Здаецца вельмі ясна. У чым-жа ўсё-такі і дзе наша „разламовая" работа"? Мо' ў тым, што мы прапануем „адрэзаць ад жывога беларускага арганізму маральную гніль, прадажніцтва і рэакцыю? Або можа ў тым, што мы выступілі супроць „нацыянальнай еднасьці" на чале з Нацкомам, у якім на кіруючых становішчах заселі нацы"?

Ня так даўно, бо толькі ў мінулым годзе „Б. Крыніца", якая рэпрэзэнтуе навонкі і Нацком, пагневаўшыся, разыйшлася з Ярэмічам фармальна за нейкі камплімэнт, сказаны ім у Сойме міністру Касьцялкоўскаму, але чамусь тое, што ў К-це засядаюць дабравольцы ахранкі, якія сваімі безпадстаўнымі даносамі імкнуцца здушыць *беларускую незалежную* прэсу. — гэта і для Нацкома і для „Крыніцы" зьявішча відаць натуральнае.

Выступленьне супроць такіх мэтадаў барацьбы і такой „нацыянальнай еднасьці" мы не лічым за разьбіваньне арганізацыі. Наадварот сцэмэнтаваньне народных сілаў заўсёды адбываецца за кошт усяго лепшага, адданага свайму народу і яго вызвольным ідэалам, адначасна адмяжоўваючыся ад усякай рэакцыі, каторая, прыкрываючыся „кансалідацыяй нацыі", выступае супроць паступовых сілаў свайго народу. Так было ў палякаў за часоў царскае няволі, калі яны востра сачылі, каб ў народныя арганізацыі не пралазілі прадстаўнікі царскай ахранкі, так было ў чэхаў, так павінна быць і ў нас.

Аб усіх „гістарычных заслугах" такога Нацкому, дзе знаходзяць мейсца Акінчыцы, спрачацца ня будзем. Хто з паважнейшых людзей назаве Нацком прадстаўніком Беларускага Народу, калі нат' сам Акінчыц у „Новым Шляху" № 2 кажа, што ўся справа палягае на тым, каб Нацком загарнуў пад свае ўплывы ўвесь Беларускі Народ! Добрае-ж гэта прадстаўніцтва, калі яму трэба яшчэ загарнуць гэты Народ!

Зразумела, што такому органу Беларускі Народ ня дасьць паўнамоцтваў на прадстаўніцтва. Мы крытыкавалі і будзем крытыкаваць гэты орган,—орган, у якім засядаюць рэакцыянэры. Абвінавачаньня „у разьбіваньні" мы не баімося. Наша газэта служыць інтарэсам працоўных мас Беларускага Народу, і толькі гэтыя масы-народ будуць судзіць аб тым ці мы займаліся разьбіваньнем калі стараліся ачысьціць яго рады з антынародных элемэнтаў.

Вось гэта для нас ясна. І пара ўжо, каб стала ясна і для рэдактара „Б. Крыніцы".

На заканчэньне можам сказаць, што пасьля выступленьня „Новага Шляху" і „Б. Крыніцы" супроць „Нашай Волі" нам яшчэ ясьней стала, што наша перадавіца „Што рабіць" была і ёсьць правільнай. Стукні па сталу — адзавуцца нажніцы, кажа народная прыказка. Ударыць па маральнай гнілі, прадажніцтву і здрадзе — завыюць нацы. Але пашто Б. Н. А. адзываецца?...

Так гавора наша сучаснасьць.
Як ні дзіўна, але гэта факт.

Чытайце і пашырайце сваю газэту.

* * *

Працы шмат дзірванее, пара ўставаць, —
не адложыш яе ты на лета, —
трэба класьці падмурак, жыцьцё будаваць! —
Не збудуеш яго без асьветы.

Хай згуртуецца весь Беларускі Народ —
і мястэчкі, і вёскі, і сёлы.
На культурны выходзьце разгорнуты фронт
дамагайцеся роднае школы!

МАКСІМ ТАНК.

За родную школу і культуру!

Школьную трагэдыю перажывае Беларускі Народ. Ён ня мае школы. Там дзе няма школы, там ня будзе і культуры. Гэта што дня пацьвярджаюць пісьмы з вёскі.

На культурны заняпад вёскі зьвярнулі ўвагу у Польшчы польскія урадовыя дзейнікі, таму, што гэты заняпад, абхапіў ужо ня толькі вёску на акраінах Дзяржавы, а і ў самым цэнтры Польшчы. З гэтае прычыны у Варшаве адбыўся з'езд польскіх грамадзкіх дзеячоў, на якім пастаноўлена падняць культуру на вёсцы.

Дзеля таго, што для іх беларускае пытаньне ў Польшчы наогул не істнуе, нам беларусам трэба арганізавана самім шукаць ратунку проці культурнага заняпаду.

Першым пунктам нашага ратаваньня павінна быць пастаўлена *складаньне школьных дэкляарацыяў на беларускую урадовую, школу.* Гэта наша права, якое мы павінны выкарыстаць да канца. Ня трэба слухаць тых ворагаў, якія цьвердзяць, што гэтае права „выгасла".

Для тых, хто не шануе ніякага права, яно „выгасла", для нас-жа яно згасьне разам з намі. Мы павінны мець сваю беларускую школу незалежна ад таго ці гэта каму падабаецца, ці не. Калі спатыкаюцца перашкоды, трэба пісаць аб гэтым у Школьны Сэкрэтарыат (Каралеўская 3—8) і ў прэсу за подпісамі бацькоў і прадстаўнікаў вёскі.

Другім пунктам, ад якога мы павінны выходзіць, бароняччы сваю беларускую культуру, павінна быць *хатняе навучаньне і саманавучаньне.* У кожнай хаце павінен быць беларускі лемантар, кожнае дзіця павінна навучыцца чытаць і пісаць па беларуску. Трэба закладаць свае беларускія культурна-асьветныя арганізацыі, адчыняць бібліятэкі—чытальні, ладзіць спэктаклі.

Вольны час паміж летнімі працамі на полі і сенажаці трэба разумна выкарыстаць для замацаваньня фундаманту нашай лепшай будучыні — беларускай культуры.

Слова мае вёска!

... Жыцьцё цяпер вядомае нам мужыкам беларусам, а што да моладзі дык і моцна труднае. Вось у нас малыя дзеці, якія ходзяць у школу, запяялі раз **беларускую песьню**. Пачуў гэта наш солтыс, хаця праўда сам і не пачуў, але яму данясьлі, дык ён пашоў і заявіў у паліцыю, што дзеці пяюць **палітычныя** песьні. Выходзіць так, што на вёсцы ўжо беларускай песьні запяяць ня можна.

А яшчэ недалёка ад нас у вёсцы Ваўкі зрабілі хлопцы музычную забаву... і была невялічкая авантура ў зьвязку з гэтым... і аднаго на сьмерць забілі хлапца... Пахароны яму зрабілі натта харошыя. Сабраліся сяляне з суседніх вёсак за 10 клм. Быў моцна вялікі паход: наперадзе нясьлі труну, а за ёй хлопцы, дзяўчаты і дзеці нясьлі вянкі, павітыя з бэзу і кветак, а за вянкамі ішлі дзяўчаты і хлапцы радамі па чатыры, а на астатку атрад цыклістаў, і так ішлі праз усё Маладэчна аж на могілкі.

Пасьля гэтага прыяжджаў пан Ваявода ў гэныя вёскі, зьбіраў усіх солтысаў і навучаў, што рабіць...

Наш солтыс „пан" Пятровіч, склікаў сход і заказаў сялянам, каб беларускіх песьняў ніхто не пяяў, бо кажа: — „Што гэта за халера, што ў маёй вёсцы такія безпарадкі, якіх яшчэ дагэтуль ня было: пасьля дзевятай гадзіны, каб я ня чуў нікога пяючы, трэба, каб быў „сьвенты спокуй". Хаця-ж мы самі гэтаму вінаваты, бо як уперад быў солтыс у другой вёсцы, дык у нас можна было і песеньку запяяць і калі-некалі забаву зрабіць. Але захацелі яшчэ сабе „быт палепшыць" — выбралі солтыса ў сваей вёсцы і „найлепей розьвінентага" — ну і цяпер маем добрае палепшаньне... Абяцаўся прылажыць усе сілы для барацьбы з усім беларускім. І прыкладае... А ўжо чырвоная ануча не заваляецца на дварэ, бо як толькі згледзіць дык кідае найпільнейшую работу і прэць яе, як чорт грэшную душу, на пастарунак і на многіх кідае падазрэньне, што нібы яны вывешваюць.

Калі толькі будзе мейсца ў „Нашай Волі", дык напішэце, як няможна пяяць у нашай вёсцы па беларуску...

Моладзь з пад Маладэчна.

Да ўсіх чытачоў.

„Наша Воля" мае вялікія матар'яльныя труднасьці. Замест двух разоў на месяц газэта выходзіць ужо толькі па аднаму разу. Калі хочаце бачыць сваю „Волю" часьцей, зрабеце высілкі, шукайце новых падпішчыкаў, зьбірайце ахвяры, тады зноў яна будзе выходзіць два разы на месяц.

РЭДАКЦЫЯ.

Міжнародны агляд.

ПАЛЕСТЫНА.

У апошніх тыднях увагу ўсіх скіравалі на сябе палестынскія падзеі. Пачатковыя паадзінокія выступленьні арабаў проціў жыдоў ператварыліся ў вялікае і сапраўднае паўстаньне арабаў—проціў англійскае ўлады у Палестыне. Цяпер уся Палестына паўстала і дамагаецца ад англійскае ўлады стрыманьня жыдоўскае іміграцыі ў Палестыну. Дамаганьне арабаў ператварылася ў буры і крывавы пратэст проціў англійскага імпэрыялізму. Арабы наўперш абвесьцілі агульную забастоўку ў цэлай Палестыне і адказаліся плаціць англійскай уладзе падаткі. Англійскі камісар паведаміў Арабскую Нацыянальную Раду, што будзе строга караць праваднікоў арабскага руху. Праваднікоў руху выслалі сваіх дэлегатаў ў Эгіпт, Сірыю, Марокко і Ірак, каб прыдбаць для арабскага руху ў Палестыне сымпатыі і помач усяго арабскага сьвету ў Азыі і Афрыцы. Англійская ўлада, прадбачачы новыя забурэньні, сьцягнула ў Палестыну шмат войска з танкамі і панцэрнымі самаходамі. Англійская прэса піша, што да арабскага паўстаньня ў Палестыне прычынілася, перадусім, Італія. Італьянскі фашызм, пішуць англійскія газэты, узбурыў і памог арабам у Палестыне проціў Англіі, каб адвярнуць увагу англійскае ўлады ад Абісыніі, якую цяпер фашызм, заняўшы, „пацыфікуе". Кожнае вялікае места ў Палестыне ператварылася цяпер ў барыкады змаганьня арабаў з англійцамі. Гарады: Яффа, Тэль-Авів, Ерусалім, Габрон, Бэйзан, Акрон, Тукарэм і Назарэт кожны дзень у вулічных боёх з паліцыяй і вайскам паліваюць крывёю вуліцы. Англійская ўлада даглядзела тако-ж, што і нямецкі гітлерызм мачае свае пальцы ў палестынскіх забурэньнях. Дзеля гэтага англійскі камісар выдаліў з Палестыны гітлероўскага эмісара Цубака. Абвешчана арабамі агульная забастоўка трывае ўжо другі месяц. Англійскі комісар увёў у цэлай Палестыне вострыя вынятковы стан, каб перамагчы забурэньне. Сяговыня Палестына ёсьць вялікім полымям змаганьня арабаў проціў Англіі. У знак салідарнасьці з арабскім паўстаньнем у Палестыне, абвесьцілі агульную забастоўку і Сырыі. Як відаць, змаганьне двох імпэрыялізмаў — ангельскага і італьянскага — у Палестыне можа разшырыць арабскае полымя далёка ў Азыю і Афрыку.

ФРАНЦЫЯ.

У выніку перамогі „Народнага Фронту" на выбарах, якія адбыліся 26 красавіка і 3 траўня — французская левіца здабыла даверанасьць француз кага вароду і цэлы траве нь прыгатаўляецца да пераняцьця ўлады ў свае рукі. У склад „Народнага Фронту" уваходзілі: камуністы, сацыялісты і радыкалы. Мясцы тварэньня новага ўраду атрымаў ад прэзыдэнта рэспублікі правадыр сацыялістычнае партыі — Лявон Блюм. Камуністычная партыя абяцала падтрымку і помач новаму ўраду Францыі, але удзелу ў урадзе не прыняла. 4-га траўня Блюм стаў з сваім урадам перад прэзыдэнтам рэспублікі. Новы урад складаецца з сацыялістаў і радыкалаў. 6-га траўня урад Блюма стаў у парляменце, дзе левіца прывітала яго дзіўгімі і бурнымі воклескамі. Прэм'ер Блюм перакалаў парляманту дэклярацыю ўраду. Найважнейшымі пунктамі ўрадавае дэклярацыі ёсьць: амнэстыя, сорак-гадзінны тыдзен працы, платныя работніцкія отпускі, вялікія грамадзкія работы, нацыяналізацыя фабрыкаў аружжа і стварэньне вялікага народнага фонду помачы безработным. „Агулам — казаў Блюм — плян ураду, гэта плян Народнага Фронту". Пасьля дэкляраціі адбылася дыскусія і галасаваньне. За урадам галасавала 384 дэпутатаў, проціў ураду 210. Новы французскі ўрад мае прад сабою цяжкую працу—гэта змаганьне з саюзам банкаў.

АБІСЫНІЯ.

Ужо можна цьвёрда сказаць, што незалежнай Абісыніі няма на сьвеце. Фашыстоўская Італія напала на гэтую безбаронную дзяржаву ў Афрыцы і за працяг некалькіх месяцаў зусім яе разьбіла і забрала. У абісынскай сталіцы Аддіс-Абэбе, дзе яшчэ нядаўна быў абісынскі урад, цяпер ужо сядзяць італьянскія фашысты. Кароль абісынскі Гайле Сэлясі ўцёк з бацькаўшчыны і прыехаў у сталіцу Англіі, каб „бараніць перад Эўропаю незалежнасьць Абісыніі". У цэлай Абісыніі фашысты завялі нечуваны тэрор. Як Эўропа памажа абісынцам здабыць назад ад італіянскіх фашыстаў сваю незалежнасьць -- ведаем усе добра. Гэтая самая Эўропа супакойна глядзела, як фашысты нішчылі абісынскую незалежнасьць і нічым гэтаму не перашкодзіла. Цяпер таксама балей чым сумніўна, каб Эўропа памагла Абісыніі. Незалежнасьць Абісыніі здабудзе толькі сам абісынскі народ у саюзе зусім іншымі паняволенымі афрыканскімі народамі.

ГІШПАНІЯ.

У месяцы лютым бяг. году адбыліся парлямэнтскія выбары ў Гішпаніі. На выбарах перамог „Народны Фронт". Урад гішпанскі, што ў 1934 годзе задушыў работніцка—сялянскае паўстаньне мусіў аддаць уладу для гішпанскай левіцы. Ад лютага ў Гішпаніі трывае штодзённая барацьба. Правіца не пагадзілася з фактам сваёга паражэньня на выбарах і стараецца вулічнымі бойкамі, нападамі на левіцовых дзеячоў і кіданьнем бомбаў у рэдакцыі левых газэтаў вярнуць свае уплывы і пры магчымасьці пры помачы духавенства, паспрабаваць здабыць уладу. Прэзыдэнтам, на мейсца Заморы, выбраны 10 траўня прэм'ер Азана.

РУМЫНІЯ.

У сталіцу Румыніі — Букарэшт прыехалі 6 траўня чэхаславацкі прэзыдэнт Бэнэш і югаславянскі рэгэнт Павал, брат забітага караля Александра. Гэтаму прыезду эўрапэйская прэса прыдае вялікае значэньне і пасьвячае шмат мейсца. Чэхаславаччына, Румынія і Югаславія твораць як ведама, гэт. зв. Малую Антанту. Нямецкаму гітлерызму гэты саюз троіх дзяржаваў страшэнна не падабаецца і Гітлер стараецца за ўсякую цану разьбіць яго. Спроба гітлероўцаў, каб перацягнуць на свой бок Югаславію, скончылася неўдачаю. Югаславія нятолькі асталася ў саюзе Малой Антанты, але яшчэ афіцыяльна заявіла, у часе візыты польскага міністра замежных справаў Бэка, што яна назаўсёды астанецца верваю старай дружбе. Паездка у Букарэшт рэгэнта Паўла і прэзыдэнта Бэнэша ёсьць яскраз пагалбленьнем гэтага саюзу і пацьверджаньнем няўдачы гітлероўскай спробы — разьбіць Малую Антанту.

БЭЛЬГІЯ.

У нядзелю 24 траўна адбыліся выбары ў бэльгійскі парлямэнт. Выбары адбыліся даволі спакойна. Насельніцтва амаль у 100% брала ўдзел у выбарах. Кароль даручыў утварэньне новага ўраду правадыру бэльгійскіх сацыялістаў Эмілю Вандэрвэльду. Сацыялісты (70 манд.) ствараць напэўна кааліцыйны ўладу з каталіцкай партыяй (60 манд.) і з лібэраламі (23). Зьмены вялікай у бэльгійскай палітыцы не прадбачыцца, толькі напэўна наступіць яшчэ большае зблізьненьне з Францыяй, бо гітлероўскі марш у прырэйнскую паласу вельмі моцна напужаў Бэльгію і ў вачавідку прыпомніў ёй няшчасную долю з 1914 году. Новы бэльгійскі урад мала будзе розьніцца ад старога, бо выбары фактычнае зьмены цэнтру не прынесьлі. Палітыка Бэльгіі будзе перадусім залежаць ад агульнага палажэньня ў Эўропе.

С. С. С. Р.

Ад 11 да 21 красавіка адбываўся Х усесаюзны з'езд Камсамолу. Варшаўскі „Robotnik" піша, што найважнейшаю зьменаю у статуце гэтага зьезду, на якую ўсе газэты зьвярнулі ўвагі, ёсьць новы пункт аб безпартыйнасьці Камсамолу. Маскоўскі карэспандэнт „Kur. Warsz." называе гэты новы пункт у статуце Камсамолу — „поўнаю дэмакратызацыяю арганізацыйнага жыцьця моладзі".

Апублікаваны праэкт новай савецкай конституцыі. Зьмест важнейшых разьдзелаў канстытуцыі:

Калхозы дастаюць зямлю на вечнае ўладаньне. нароўні з соцыялістычнай сыстэмай гаспадаркі дазваляецца сыстэма прыватнага землеўладаньня, заснаваная на асабістай працы. Грамадзяне маюць права прыватнай уласнасьці на дамы, невялікія гаспадаркі і прадметы дзеля асабістага карыстаньня.

У склад СССР уваходзіць 11 саюзных рэспублік заместа ранейшых 7. Кожная рэспубліка мае сваю ўласную конституцыю і мае права выхаду з Саюза.

Закон Саюза мае пяршэнства перад законам асобнай рэспублікі.

Найвышэйшым органам законадаўчай дзяржаўнай ўлады СССР зьяўляецца Найвышэйшая Рада(Верховный Совет), які выбіраецца на 4 гады.

Найвышэйшая Рада (Верховный Совет) складаецца з двух палатаў: Саюзнай Рады і Рады Нацыянальнасьцяў.

Нармальныя сэсіі Найвышэйшай Рады склікаюцца два разы на год, Прэзыдыюм Найвышэйшай Рады адвае перад Найвышэйшай Радай і мае надта шырокія паўнамоцтвы, у якія уваходзіць назначэньне і звальненьне камандуючага усімі аружнымі сіламі СССР.

Паміж сэсіямі Найвышэйшай Рады Прэзыдыюм яе можа абвяшчаць вайну, заключаць мір і ратыфікаваць (зацьвярджаць) договары з іншымі дзяржавамі.

Член Найвышэйшай Рады ня можа быць арыштаваны і пацягнены да судавай адказнасьці бяз згоды Рады або яго Прэзыдыюма.

Найвышэйшая Рада на аб'еднанай сэсіі выбірае урад СССР.

Кожная саюзная рэспубліка мае сваю Найвышэйшую Раду. Урад СССР або Народны камісар павінен адказаць на прапанову з 3 дзён на запытаньне дэпутата. Судзьдзі выбіраюцца на 3 гады на аснове простага, роўнага, тайнага і агульнага галасаваньня.

Царква ў СССР прызнаецца аддзеленай ад дзяржавы, а школа ад царквы. Новая канстытуцыя гарантуе свабоду веравызнаньня, як і свабоду антырэлігійнай прапаганды.

Гарантуецца так-жа свабода слова, друку, сабраньняў і саюзаў. Нікто на можа быць заарыштаваны ў СССР інакай, як на падставе пастановы суда, або па загаду пракурора. Выбарчыя правы мае кожны грамадзянін, які мае 18 гадоў.

Выбары ў законадаўчыя органы зьяўляюцца агульнымі, роўнымі, простымі і тайнымі.

Агляд сьвяткаваньў першага мая.

1 майскае сьвята працоўных сёлета прайшло пад знакам выяўленьня салідарнасьці і арганізаванасьці дзеля абароны ад наступа фашызму. На ўсім сьвеце дзень гэты прайшоў вельмі урачыста і парадак і спакой ня быў нідзе нарушаны, апрача Баўгарыі, Палестыны, дзе дайшло да крывавых падзеяў.

Падамо паводле „Работніка" кароткі агляд прабегу, гэтага сьвята ў краі і загранцай.

Ува Францыі дзень 1 мая прайшоў спакойна. У галоўных рабочых асяродках большасьць работнікаў на працу не зьявілася. Пасьля поўдня ў Парыжу адбыліся вялікія рабочыя мітынгі.

У Гішпаніі дзень 1 мая абходзіўся, як афіцыяльнае сьвята, пры поўным спыненьні працы. У сталіцы прайшла дэманстрацыя ў якой удзельнікам каля 250 тысячаў асобаў. Паход ішоў 2 з паловаю гадзіны. На чале маніфэстантаў ішлі павадыры сацыялістаў з Лярыё Кабальеро на чале.

У Сталіцы Савецкага Саюзу ў Маскве сьвяткаваньне адбылося ў разьмерах значна шырэйшых чым у папярэдніх гадох. На Чырвоным Пляцу адбыўся вайсковы парад і прысяга рэкрутаў. Пасьля войска прайшло каля 1½ мільёнаў арганізаваных работнікаў.

У Амэрыцы, ува ўсіх вялікшых гарадох адбыліся паходы. Лік удзельнікаў паходу ў Нью-Ёрку абліча юць на 250 тысячаў. Першы раз у 1-майскім паходзе ўдзельнічалі камуністы.

У Польшчы ў дзень 1 мая выявілася салідарнасьць працоўных гораду і вёскі, пры чым у сьвяткаваньні і паходах удзельнічалі ня толькі сяляне ўжо зьвязаныя з работніцкім рухам. У рады паходаў ўліліся новыя групы сялян з „Страніцтва Людовага" якія прыйшлі, каб выявіць сваю салідарнасьць з рабочай клясай.

У рады паходаў сталі і новыя сілы маладога пакаленьня, якія раней былі ў іншым лягеру, гэта—Легіон Маладых і Лявіца дэмакратычнае моладзі.

Другое, на што трэба зьвярнуць увагу, гэта ўзаровы парадак, якім адзначаліся паходы. Масы работнікаў, сялян і працоўнае інтэлігэнцыі выявілі суровую дысцыпліну і паказалі, што „вуліца" здолее выконваць бяз пратэстаў і бяз ніякіх падзей, загады сваіх павадыроў.

У Варшаве ня было, аднаго супольнага паходу ўсіх работніцкіх арганізацыяў—адбылося некалькі самастойных паходаў. Найвялікшым быў паход ППС., у якім налічвалася каля 50 тысячаў асобаў.

У Кракове адбыўся адзін супольны паход пры удзеле 30 тысячаў зарганізаваных работнікаў і працоўнае інтэлігэнцыі.

У Львове дзень прайшоў у настрої, якога не памятуюць найстарэйшыя. У шэрэгах маніфэстацый, якія налічвалі да 40 тысячаў, ішлі працоўныя — палякі, украінцы і жыды. Апрача чысто работніцкіх арганізацый удзельнічалі там і групы сялянскай моладзі з „Віці", Саюз Польскай Дэмакр. Моладзі—левіца і Легіон Маладых. З.З.З. адбыло спачатку самастойны мітынг, а пасьля далучылася да супольнага паходу, які йшоў з сьцягамі абвітымі жалобай. Аркестры ігралі хаўтурны марш.

У Лодзі пад 1 майскімі сьцягі сабралася каля 80 тысячаў зарганізаваных работнікау.

У Вільні адбыўся адзін суполны паход усіх работніцкіх арганізацый і саюзаў і працоўнае інтэлігэнцыі, у якім удзельнічалі і беларусы. Паход налічваў каля 10 тысячаў асобаў. Падчас паходу выяўляліся сымпаты і прыхільнае адносіньне яго ўдзельнікаў да беларускага вызваленчага руху.

З Польшчы.

Пахароны сэрца Маршалка Пілсудскага.

12 траўня ў Вільні адбылася жалобная урачыстасьць пахароны сэрца Маршалка Пілсудскага і яго Маткі у спэцыяльна пабудаваным маўзалеі на Росах. На урачыстасьці былі: Прэзыдэнт Рэспублікі, Урад, Сойм, Сэнат, прадстаўнікі вышэйшых польскіх школ, вайсковых часьцей, суд, адвокатура і многа дэлегацый з усіх канцоў Польшчы. Пасьля таго, як цела Маткі і сэрца Маршалка было зложана у маўзалеі Пан Прэзыдэнт сказаў перад мікрафонам прамову аб заслугах Пілсудскага для ускрашэньня і узмацаваньня польскай дзяржаўнасьці.

10-лецце Прэзыдэнта на сваім посту.

Па усёй Польшчы адбылося 3 чэрвеня сьвяткаваньне 10-лецьця на посту Прэзыдэнта проф. І. Мосьціцкага.

Зьмена Ураду.

15 траўня наступіла зьмена Ураду, аб якой ужо даўно хадзілі чуткі. На чале новага Ураду стаў гэн. Славой-Складкоўскі, які аднача сна абняў і тэку міністра Унутраных Справаў. Дасёлешні прэм'ер п. М. Касьцялкоўскі ў новым Урадзе стаўся Міністрам Працы і Грамадзкае Апекі. Наступіла зьмена і ў Міністэрстве Гандлю і Прамысловасьці і Справядлівасьці. Рэшта міністэрстваў пазасталіся ў старых руках.

Надзвычайная сэсія Сойму.

30 траўня дэкрэтам Прэзыдэнта адчынена надзвычайная сэсія Сойму і Сэнату для разгляду шэрагу спра-

(Далей на ст. 6 ай).

СУПОЛЬНЫЯ ФРОНТЫ.

У апошнія часы сталася вельмі папулярнай справа супольных франтаў, ня толькі сярод групаў радыкальных, але і сярод рэакцыйных. Нядаўна ў Польшчы паўсталі аж два гэткія фронты. Найбольш рэакцыйныя дзейнікі ў асобах: Вітаса, Падэрэўскага, гэн. Гальлера, гэн. Сікорскага і польскага хадэка Карфантага стварылі супольны фронт на паседжаньні ў габінэце Падэрэўскага. Гэты фронт абымае групы ад правіцовае часткі „Стронніцтва Людовэго“, да эндэцыі і хадэцыі ўключна. З вялікай радасьцю прывіталі гэты фронт эндэцыя, абшарнікі і ксяндзы З другога боку паўстаў сярод моладзі цэнтралевы фронт „Легіону Млодых“, „Звёнзку Польскай Млодзежы Дэмократычнай-Правіца“ і Цэнтральнага Аддзелу „Млодзежы Польскай Партыі Соцыялістычнай“. Гэтае паразуменьне, хаця-ж і назвала сябе „Абозам Польскай Левіцы“, па сутнасьці не зьяўляецца злучэньнем радыкальных групаў. Адзінай радыкальнай групай зьяўляецца тут П. П. С. Сфармуляваньне дэкларацыі гэтага паразуменьня зьяўляецца агульным і памінае можа найбольш балючыя справы ў Польшчы, як прыкладам, нацыянальнае пытаньне.

Як-бы адказам на гэты фронт было паразуменьне „З. П. М. Д. Левіцы“ і „Звёнзку Незалежнай Млодзежы Соцыялістычнай“. Гэтыя арганізацыі на супольна ладжаным сходзе прынялі дэкларацыю ідэовую і згадзіліся на далейшае супрацоўніцтва На ўвагу заслугоўвае не толькі яснае сфармуляваньне сацыяльнае праграмы але і выразная пастаноўка нацыянальнага пытаньня, каторае вырашаецца паводле іхняй праграмы дамаганьнем поўнай палітычнай, культурнай і гаспадарчай аўтаноміі для нацыянальных меньшасьцяў.

* * *

Сьмела і наперад
з адвагаю ўсе
ідзём і не хістаемся
ў цяжкай барацьбе.
Хоць ногі мо змарыліся
ня сойдзем мы на бок.
Далёка чуеш смелы наш
магучы звонкі крок.
І поўны гарту сілы мы
ня страшна ночы цень
над намі і над паўшымі
устане новы дзень.

АНАТОЛЬ ДЗІК.

Капіталістычная гаспадарка.

На 2200 мільёнаў людзей налічваецца 500 да 600 мільёнаў такіх, каторыя прачнуўшыся раніцай задаюць сабе пытаньне, што будуць сяньня есьці. Большасьць другіх-жа жыве наагул так бедна, што жыцьцё гэтае нягодна чалавека, істоты, якая сваім розумам здолела апанаваць сілы прыроды.

У апошнія часы праведзена анкета (апытаньне) ў справе спажывецкіх здольнасьцяў амэрыканскага народу, якая дала вельмі цікавыя вынікі. 76,3 проц. народу Злуч. Штатаў распараджаецца толькі 35,5% грамадзкага даходу. З гэтага вынікае, што сучасная „вялікая“ прадукцыя не зьбліжаецца нават да граніц спажыўчых здольнасьцяў народу.

Няма такім чынам надпрадукцыі, ёсьць толькі недаяданьне, найчасьцей з прычаны немагчымасьці набыць прадукты. Слушна сказана, каліб кожны ў Эўропе, мужчына, жанчына і дзіця, спажывалі нават толькі столька, сколькі патрэбна дзеля падтрыманьня жыцьця, дык „надпрадукцыі“ ня было-б. Тэрмін „надпрадукцыя“ у сучасных варунках азначае толькі, што ёсьць артыкулы, якія не знаходзяць купцоў.

Вырашэньне пытаньня палягае не на тым, — як гавораць нам палітыкі, якія сваю ўладу атрымалі з рук прадуцэнтаў, — каб накіроўваць грамадзкую гаспадарку супроць інтарэсаў спажыўцоў, а наадварот, на ўзмацоўваньні набыўчых здольнасьцяў спажыўцоў. Пад відам абароны інтарэсаў прадуцэнтаў палітыкі большасьці краёў стараюцца павялічываць незапрацаваныя даходы і дзеля гэтага павялічываюць пошліны, надаплаты і падаткі, пакідаючы для спажыўца толькі вочы для плачу. Але вэндза спажыўца выклікае за сабой і нэндзу прадуцэнта, а зямля, якая дзякуючы машынам і поступу веды павінна была-б стацца раем, становіцца толькі вялікай далінай плачу.

Прэзыдэнт Рузвельт, прарок пляновай і ўпарадкаванай гаспадаркі, дае загад зьнішчыць ураджай на $22\frac{1}{2}$ мільёнах гэктараў, і за гэта выплачывае з дзяржаўнай казны адшкадаваньне земляўласнікам. У Флёрыдзе зьнішчаны ўраджай морквы і сэлераў. У Каліфорніі зьнішчаны ураджай пэрсікаў, ігруш, маліны і ў жніўні 1935 г. $1\frac{1}{2}$ мільёна памаранцаў. У Лёс-Анжолесе 200 тысячаў літраў малака выліта ў каналы. У Злуч. Штатах у 1933 г. выразана 6.220 000 сьвіней і кароў. У Даніі і Галяндыі скаціна выбіваецца сыстэматычна. У Эгіпце вішчыцца бавоўна. У Канадзе ячмень ужываецца на апал, а у Бразыліі да 15 верасьня 1935 году зьнішчана 35.254.525 мяшкоў кавы. У Чылі зарэзана 225 тысячаў барачаў, з якіх аніводзін ня зьедзяны, а колькі сотак тысячаў авечак кінута на разарваньне арлам. У Аляснэ, у Вялікабрытаніі, у Гішпаніі, у Францыі „надмерныя“ ўловы кідаюцца хутчэй у мора замест таго, каб аддаваць іх у шпіталі, прытулкі і безработным. На Цэйлоне спалена 30.000 тон гарбаты.

Нядаўна „Нэв Йорк Пост“ выявіла сьмерць 2.400.000 чалавек ад зьнясіленьня і самагубства 1.200.000, якія не маглі вытрымаць голаду, а ў гэтую самую пору, як процівага, адзнатоўваецца зьнішчэньне 267.000 вагонаў кавы, больш мільёна вагонаў збожжа, 258 мільёнаў кілёграмаў цукру, 26 мільёнаў кілёграмаў рыжу і 25 мільёнаў кілё мяса.

Гэтак выглядае пляновая гаспадарка пры сучасным ладзе.

(Паводле „Le Cooperateur Suisse“)

З усяго сьвету.

— У першых днёх траўня адбыліся выбары ў эгіпскі парлямэнт. Перамаглі Вафдысты (незалежныя нацыяналісты). Перамогаю Вафдыстаў вельмі занепакоілася Англія, баючыся, што Эгіпт захоча зусім скінуць з сябе англійскую „апеку“.

— 16-га траўня адбылося ў Бруксэлі паседжаньне экзэкутывы II Інтэрнацыяналу. На паседжаньні пастаноўлена завастрыць барацьбу абароны дэмакрацыі процiў наступу фашызму-гітлерызму.

— У няміласьць гітлероўцаў папаў слаўны нямецкі інжынер Экэнэр, які будаваў і кіраваў вялікім цэпэлінам. Гітлероўцы закідаюць Экэнэру, што ён ня ёсьць лёяльным да Гітлера.

— Англійская незалежная прэса цьвердзіць, што Ліга Нацыяў ужо зусім збанкрутавала. Немагчымасьць абароны Абісыніі перад італьянскім імпэрыялізмам аканчальна даказала, што Ліга Нацыяў ёсьць зусім бязсільнаю.

— Заступнік старшыні ваеннае камісыі нанкінскага ўраду, маршал Фэнг-Юг-Сунг заявіў англійскаму карэспандэнту, што толькі саюз Кітаю з Саветамі змогбы стрымаць японскі наступ на Кітай.

— Францыя і Англія паслалі свае засьцярогі Італіі, процiў заваеваньня Абісыніі.

— Італіянскі кароль Віктар Эмануіл абвесьціў 9 траўня абісынскім імпэратарам.

— 13-га траўня ў цэлай Грэцыі абвешчана агульная забастоўка. Работніцкія саюзы дамагаюцца павялічэньня заработнае платы.

З газэт.

— „Dziennik Wileński“ з дня 10.VI 1936 г. падае, што варшаўскі аддзел польскага саюзу вучыцялеў, на агульным сходзе, аднагалосна пастанавіў далучыцца да цэнтралі профэсыянальных саюзаў (рабочых), якія стаяць на грунце клясавай барацьбы. Падобныя рэзалюцыі вынесьлі вучыцельскія аддзелы Кракова, Хойніц, Ўроцлава.

— Памешчыкі Палесься („Słowo“) зьехаўшыся ў Пінску, ухвалілі падтрымаць урад ген. Складкоўскага, бо ён не прарочыць падзелу маёнткаў. Як бачым, каму што—а памешчыкі—абы ім землю аставілі. Хай сабе людзі на вёсцы душацца на шнурох, недаедаюць усё жыцьцё—абы ім абшарнікам сыта было.

— Як падае „Illustrowany Kurjer Codzienny“ з дня 10.VI-1936 г. прадстаўнікі польскай незалежніцкай арганізацыі „Zarzewie“ на з'ездзе прызналі — што на дарозе 18 гадоў (1918 год. — калі яны бароліся за Польшчу—я 1936 год.—калі ены радзіліся на з'ездзе) згубілі Польскі Народ і пастанавілі яго шукаць.

Карэспандэнцыі.

— ТАЛЬКАЎШЧЫНА, Слонім. павету. Культурны рух у яго арганізаваных формах адышкў у мінуўшчыну. Гарэлка, карты, а нават бойкі былі першымі формамі вонковага выгляду духовае трагэдыі. Але зноў зьмянілася Талькаўшчына і то за кароткі час Моладзь цікавіцца культурным жыцьцём. Выпісвае часапісы розных нацрамкаў. Але і тут перашкода! Супольнае чытаньне газэт строга забаронена!

— І што-ж мы вінаваты,—кажуць хлопцы—што ня ўмеем чытаць? Школа не дае нам адукацыі, а цяжкія умовы не пазваляюць здабываць веду прыватна—вось і зьбіраемся, каб супольнымі сіламі перамагчы і папоўніць тое, чаго нам бракуе!

А. І.

— ТАРНАПОЛЬСКАЯ гміна, Ваўк. Павету. Уся моладзь нашае гміны за невялікім выняткам займае вельмі нізкую ступень ў культурным жыцьці пасярод суседніх гмінаў. Кнігі і газэты рэдка трапляюць ў рукі моладзі: якая болей займаецца цёмнай работай. Ужо падросткі узбройваюцца нажамі, пружынамі і малаткамі У працягу году здараецца не адно забойства. Польскія „кулкі“ і арганізацыі ані якога ўплыву і аўгарытэту ня маюць.

Р

В. ГЛІНЯНЫ, Горадзенскага пав. У нашай вёсцы завяліся „боювкажы“, якія нажом і гірай хочуць „здабыць“ сабе моладзь. Ходзяць па вёскам і разганяюць вечарыны. Сяляне ненавідзяць іх, як найгоршых дзікуноў. Мы нядаўна ладзілі беларускі спэктакль, а яны, напіўшыся, хацелі падчас прадстаўленьня учыніць скандал. Але мы не далі справакаваць сябе, спэктакль яшчэ паўтарылі і на другі дзень. Пасьля спэктаклю пачынаюцца напады на паасобных сябраў нашай драматычнай групы. І што пры гэтым вельмі характэрна, яны праходзяць пад лёзунгам: „Выразаць прадажнікаў“. Тут справа ўжо не ў п'янастве. За імі нешта большае, як звычайны выбрык. Вось дзе блізкія сваякі „нашага“ Акінчыца. Мне здаецца, што іх гура — баювкарскі характар прышоўся-б яму па носе. Вось якая гніль у нас завялася.

Стары.

В. МАЛЫЯ-КРАГЛІ, Навагр. павету. Моладзь наша любіць чытаць беларускія газэты. Грошай трохі пасылаем цяпер, будзем рабіць гэта і далей і заклікаць другіх. Толькі цяжка з грашыма: хлапец можа зарабіць ходзячы да двара 70 гр., а дзяўчына 60. І то яшчэ шчасьце, калі прымуць.

Я. Сумны.

— В. ВЫВЕР, Маладэчанскага пав. У нас няма ніякай культурнай арганізацыі, няма бібліятэкі—чытальні. Газэту выпісваем самі, але наш солтыс такі дурны, што не пазваляе чытаць, кажа: — кідайце чытаць, а то будзе блага“! Таксама забараняе перадаваць газэту другім і ўсё пагражае. Вось-жа, браткі сяляне, такі-ж самы бядак як і кажды з нас, а які шкоднік, як выслужваецца!

Вяскоўцы.

В. ПАЎБЕРАГ, Навагрудзкага павету. Моладзь нашае вёскі вельмі цікавіцца чытаньнем беларускіх газэт і найболей часу праводзіць за кніжкамі і газэтамі. Нам здаецца, што толькі гэта паставіць нас на шлях лепшае будучыні.

Я. Зорка.

В. БАЯРЫ, Пастаўскага павету. Жыхары нашае вёскі ўсе Беларусы, у большасьці малазямельныя. Калі настане вясна, дык няма кавалка хлеба для дзяцей. Ня гледзячы на такую бяду саквэстратар і ня вылазіць з вёскі, цягнець апошнюю карову. Мужчыны, а такжа хлопцы ня зважаюць на бяду, граюць ў карты і п'юць гарэлку, трацячы здароўя й грошы. Праўда ёсьць і сьвядомыя сяляне, каторыя любяць пачытаць, альбо паслухаць беларускую газэту, як „Наша Воля“. Заклікаю дарагую моладзь, каб кінула пустыя гульні, а узялася за чытаньне беларускіх газэт і кніжак. А такжа звяртаюся да дзяўчат, каб узяліся такжа за культурна-прасьветную працу.

Вясковец.

СЕНЬКІВІЧЫ, Косаўскага павету. Моладзь у нашай вёсцы апошнімі часамі зачала піць гарэлку, і біцца. Нават падзялілася на дзьве групы, асобна робіць вечарыны. У нашай вёсцы ёсьць пару асоб, якім залежыць, каб ніколі нашая моладзь ня жыла ў згодзе, а білася. Дарагая моладзь, гэта не нашыя прыяцелі, і мы іх не павінны слухаць.

Давайце мы лепей вазьмемся за лепшую працу, як калісь нашае старэйшае пакаленьне ў гуртку ТБШ;. будзем жыць у згодзе, тады ўсё пераможам.

Селянін.

НОВАЯ-ВЕСЬ, Наваградзкага павету. Моладзь наша, як хлапцы, так і дзяўчаты, пачынаюць цікавіцца ўсімі праявамі культурна-грамадзкага жыцьця: кніжка, газэта, спэктакль, музыка, беларуская песьня — гэта хлеб культурны, каторы штораз энэргічней выпірае гарэлку. Робяць рэпэтыцыі саматугам, што трэба прызнаць удаецца досыць добра, а ў некаторых адзінак нават досыць мастацка; усё гэта робіцца вельмі ахвотна і ахвярна. Адна толькі труднасьць: ня маем арганізацыі, каб на яе мэту паставіць. Прабавалі ўжо другі раз залегалізаваць ТБШ., але ўсё выходзіла на марна. Цяпер вёска пастанавіла на сходзе адчыніць бібліятэку-чытальню грамадзкую. Паслалі да старасты павятовага, каб дазволіў яе адчыніць, але адказу няма; калі такая будзе адчынена, то тады толькі вапраўду праца закіпіць. Працы і ахвярнасьці не пашкадуем, як малыя (о, гэтыя да гэтага гарачыя?) так і старыя, каб ня мець плямы на сваёй вёсцы перад беларускім грамадзянствам. Адчынялі калісь беларускую коопэратыву — няўдалося, але мы замераў не зракаемся, бо мы на гэта маем права і мы гэтага ўсе хочам.

Дамагаліся беларускай школы і далей будзем дамагацца, бо сучасная школа польская, з беларускай мовай для вока, не дае нам нічога, а толькі паваротны анальфабэтызм. „Нашу Волю“ вітаем братнім усклікам — „Наперад“!

Паплавец.

З Польшчы.

(Працяг).

ваў, а ў іх ліку і справу паўнамоцтваў для Ураду, да выдаваньня дэкрэтаў да восені, г. зн. да скліканьня звычайнай буджэтнай сэсіі.

На першым паседжаньні выступіў з кароткай прамовай прам'ер гэн. Славой-Складкоўскі, які зазначыў, што яго урад, як і папярэднія, будзе кіравацца наказамі Маршала Пілсудскага і перадусім зьверне ўвагу на абарону дзяржавы, а пасьля на беспрацоўе, якому абвяшчае бязлітасную барацьбу.

Палітычныя працэсы.

У акружным судзе ў Радоме адбываецца зьвязаны з г. зв. „падзеямі ў Прытыку“. На лаве абвінавачаных 43 селян і 14 жыдоў. Паводле акту абвінавачаньня, у м. Прытыку ў кірмашны дзень адбыліся антысэміцкія разрухі, падчас якіх адзін селянін і два жыды былі забітыя.

У Катавіцах адбываецца працэс 115 сяброў Нямецкіх Нац.-Сацыялістаў. Усе абвінавачываюцца ў здрадзе і імкненьні адарваць ад Польшчы Горны Шлёнск.

Кангрэсы барацьбы з антысэмітызмам.

13 чэрвеня меліся адбыцца ў Варшаве 2 кангрэсы барацьбы з антысэмітызмам, якія ладзілі Бунд і Поалей-Сыён. Улада ў апошнія дні дазволу на гэтыя кангрэсы не дала.

Аб прамове г. Рыдз-Сьміглага.

На зьезьдзе Легіяністаў гэн. Рыдз Сьміглы выступіў з прамовай, якую прэса ацэнівае, як пачатак новай унутранай палітыкі Польшчы. Прадбачыцца зьмена закону аб выбарах у Сойм і Сэнат.

Кангрэс Абароны Культуры.

16 і 17 траўня ў Львове адбыўся кангрэс прадстаўнікоў навукі, літэратуры і мастацтва, прысьвечаны справам абароны культуры.

З беларускага жыцьця.

— МАТУРА Ў БЕЛАРУСКАЙ ФІЛІІ. 28 траўня скончыліся матуральныя экзамены у Беларускай Філіі Дзяржаўнай Гімназіі ім. Ю. Славацкага. З дваццацёх шасьцёх дапушчаных да экзаменаў 4 асобы пасьля пісьменных адпала. Экзамены злажылі: А Акаронка, В. Говар, П. Гірыс, С. Грыцук, А. Дарафейчук, А. Дубовічанка, В. Ярмалковіч, Х. Здановіч, Т. Іванкевічанка, У. Кароль, У. Касоўскі, І. Ламеко, В. Люсьцібэр, В. Панагайба, У. Панько, Л. Пауль, Першукевічанка, З. Рагулянка, А. Сечка, Н. Тарас, Чэльевіч, І. Прасьняк. Апрача вучняў гімназіі складалі матуральныя экзамены экстэрысты: М. Мінкевіч і С. Падагель.

— КАНЕЦ ШКОЛЬНАГА ГОДУ. У Беларускай Філіі школьны год закончыўся 1 чэрвеня, дзеля таго, што будынак Гімназіі патрэбны Т-ву Турыстычнай Прапаганды. Абвестку аб уступных экзаменах падае у гэтым, годзе ужо не Гімназія ад сябе, а Т. Б. А. Раней падавала абвесткі аб варунках прыйма Дырэкцыя Гімназіі, як тады, калі Гімназыя меля канцэсыянера, так і пасьля таго, як сталася Дзяржаўнай.

— „КАЛООСЬСЕ“. Выйшла з друку 2-я кн. за 1936 г. У гэтай кніжцы часапісу асабліва багата прадстаўлена поэзія М. Танка—10 бачын. Далей ідуць вершы Машары, Арсеньневай, Васілька, Бярозкі, Быліны Я. Пачопка сваім вершам „Смерць“ хоча нагнаць страху на чытача, але, прачытаўшы яго, ніякага ўражаньня не застаецца, апрача зьдзіўленьня, як гэта так выходзіць, жто сьмерць

„шчырыць рот бяззубы
І скрыгочуць зубы“...

Канчаецца літаратурная частка апавяданьнем Я. Бурака—„Шчасьце“. Сужэт нейкі экзотычны (чужаземны), з нявольнікамі, танцоркамі пахучымі зёламі. Пашто гэтая гульня ў экзотыку, калі можна браць тэмы з жыцьця работнікаў, якое павінна быць добра знаёма аўтару. Апрача таго само апавяданьне засьмечана барбарызмамі (чужымі славамі), над якімі трэба доўга думаць, каб усё-ж такі нічога не зразумець. Вось для прыкладу:

„Пасьля падрабязнае *аналізы* духовых *працэсаў* праз *прызму зьменнасьці вонкавых зьявішчаў*, ён *сынтэтычна* канчаўся наступнай *аксыёмай* і г. д.

А яшчэ рэдакцыйная калегія належыць да „чысьціцеляў“ беларускай мовы!

З публіцыстычных артыкулаў на першае мейсца выбіваецца артыкул Мгр. С. Аленьчука, „Крытычныя увагі да артыкулу „Цені і блескі“ А. Станкевіча“. Новае у „Калосьсях“ валачобная песьня з нотамі, апрацаваная Галкоўскім для хора, якая мае дапаўняць артыкул Р. Шырмы аб валачобных песьнях.

— НА ЛІТЭРАТУРНАЙ ГОРЦЫ на Росе 6 чэрвеня адбылося адсланеньне памятніка на магіле беларускага поэта К. Сваяка (кс. Стэповіча).

ВЫБЕГ Б.С.С. У НАВАГРАГЧЫНУ.

За прыкладам прошлага году Беларускі Студэнскі Саюз У.С.Б. з мэтаю пазнаваньня Роднага Краю ладзіць сёлета турыстычны выбег сяброў і сымпатыкаў у Наваградчыну.

Зборка 12.VII б. г. ў вёсцы Валяўцы (3 км. ад возера Сьвітэзь) каля царквы а гадз. 11.

13.VII — над возерам Сьвітэзь.

14.VII — Сьвітэзь — вёска Вароньча — м-ка Цырын (прыблізна 20 км.)

15.VII. — Цырын — в. Далматаўшчына — м-ка Турэц — м-ка Ярэмічы над Нёмнам (25 км.)

16.VII — м-ка Ярэмічы — уздоўж Нёмна і Налібоцкае пушчы да Шчорсаў, — у глыб пушчы — возера Кромань (20 км.)

17.VII — Кромань – м. Любча (20 к.)

18.VII м. Любча, м. Негневічы. (10к)

19.VII Негневічы — Наваградак 20км) Разьвязаньне выбегу.

„Першыя зерняткі“.

У папярэднім нумары „Нашай Волі“ мы падавалі вестку аб выхадзе з друку беларускай граматкі, „Першыя зернятк“, Сяргея Паўловіча.

Як і ўсе кнігі Паўловіча, так сама і гэтая, уложана і выдана надта старанна і акуратна. Нават з вонкавага боку кніжка пакідае прыемнае ўражаньне: выдана на добрай паперы, мае чысты друк і багата ілюстравана ўзапраўды па мастацку зробленымі малюнкамі. З боку зьместу аўтар справіўся са сваей задачай, як найлепей. Уся труднасьць гэтае працы палягала на тым, што кніжка прызначана не для школы, бо мы іх ня маем, а для хатняга навучаньня. Гэта значыць ня толькі для дзяцей школьнага веку. а можа нават і пераважна для тэй моладзі, якая пазастаецца за школай, або канчыўшы польскую школу праз год часу робіцца паўторна няграматнай.

Дзеля гэтага па за лемантарнай часткай даецца багатая чытанка для дзяцей з пад'аддзеламі: забавы дзяцей, Беларусь і беларусы, прырода і праца на Беларусі, культура і поступ, вучэньне — сьвет, нявучэньне — цьма. З боку ідэйна падагагічнага — чытанка на вышыні заданьняў: кожны верш ці апавяданьне стварае настроі, у якіх адчуваецца глыбокая пашана да нашай працоўнай Беларусі. Для чытанкі выкарыстаны адпаведныя творы нашых поэтаў — ад клясыкаў Купалы, Коласа і канчаючы самым маладым — Максімам Танкам. Аднак побач з гэтым аўтар не ўсьцярогся зрабіць пару памылак.

Першае, зьмешчаны верш Уніцкага „Вясной“, — няўдалая перафразіроўка такога-ж самага вершу З. Бядулі.

Для прыкладу страфа вершу Уніцкага:

Весялей глядзяць сядзібы,
дзеці — з песьняй на дварэ...
на лужку авечкі скачуць,
а ягняткі — мэ-мэ-мэ!

А вось адпаведная страфа ў Бядулі:

Шэпчуць дрэвы. Грае рэчка.
Квохчуць куры на дварэ.
Скок і скок на луг авечка,
Брыкне, крыкне: мэ-мэ-мэ!

Для такой важнай рэчы, як кніжка для дзяцей, дзе даюцца пачаткі азнаямленьня з роднай поэзыяй, браць, кажучы далікатна, недарэчнае наследаваньне замест цудоўнага арыгінала, гэта ёсьць прыкры недагляд. Апрача таго, Бядуля занадта вялікі мастак слова, каб рабіць замену на нейкага Уніцкага.

Па другое: вершы нашага песьняра М. Машары „Вясковая хата“ і „У хаце“, дзе даюцца мастацка праўдзівыя малюнкі нашай вясковай галіты знаходзяцца ў поўнай супярэчнасьці з апісаньнем сучаснай вёскі ў артыкуле „вёска даўней і цяпер“. Паводле апошняга вельмі ідэальна „ужо добра ў нашых хатах“: падлога з дошак, табурэты, крэслы, шафы, камоды, лямпы і г. д. Але ці многа такіх хатаў? Можа некалі дачакаемся — гэта іншая рэч.

Аднак такія, па-нашаму, рэдакцыйныя недагляды ніскольні нэ абніжаюць вартасьці кніжкі.

Треба яшчэ дадаць, што аўтар лае для азнаямленьня, побач з азбукай гражданкай і лацінку, і для прыкладу верш „Вясковыя дзеці“ надрукаваны аднэй і другой. Толькі чамусь-ці „Б. Крыніца“ (№ 18) капнула сьлязу, што граматка адстрашыць ад сябе мільён каталікоў беларусаў, дзеля таго, што надрукавана гражданкай, „адвечным доказам“, што гэта „рускае маскоўскае“. Каталіцкая „Б. Крыніца“, маючы доступ да каталікоў, павінна вытлумачыць, што ў той час, калі Масква была яшчэ вёскаю, ужо Фр. Скарына надрукаваў біблію па-беларуску гражданкаю. Так дзеля чаго такія страхі? Тым балей, што ў адным з далейшых нумароў „Б. Крыніца“ сама прызнае, што польскі нацыяналізм карыстаецца лацінкай, як срэдствам для вынарадаўленьня беларускага народу.

В. М.

ВЕРШАВАЯ СКРЫНКА.

МІХАСЬ ЛІСТ: Рытміка: на палову апанавалі. Тэма апрацавана слаба, думка не ясная. І, як-бы на агульнае рыштаваньне не начэплівалі найбольшую колькасьць слоў, верш, бяз ясна праведзянай думкі, мастацка апрацаванага языка і формы, ня будзе яшчэ вершам.

ДУБРОВІЧ: Больш чытайце. Тое, што напісалі гавора толькі аб тым, што хочаце пісаць, а гэта ўжо задатак, каб навучыцца. Пішэце менш, але лепш апрацоўвайце.

А. ПОБЕДІНСКІЙ: Вершы вашы — стылізацыя народных — толькі шкада што, адкінуўшы мастацкія вартасьці народнай песьні і іх соцыяльны зьмест, не далі ў замен нат і паловы. таго, што можна было даць. Агулам, як на першы раз—не блага. Пішэце.

ЗВАНАР: Пара адарвацца ад кветак, ды ад хмар, бліжэй падыйсьці да жыцьця. Ці яно так ад вас далёка, што, каб яго ўбачыць і апісаць трэба лезьці на такія кволыя драбіны, як хмары і т. п. прылады вашай паэзыі. Бліжэй да жыцьця, тым больш, што вы можаце пісаць, і некаторыя рэчы Вам удаюцца. Прысылайце больш матэр'ялаў.

М. ЗАСІМ: За вершы дзякуем. Друкуем. Менш ужывайце ў вершах „польска-беларускай“ трасянкі.

М. ПАДБЯРЭСКІ: Пішэце. Матэр'ял прысланы мо выкарыстаем у наступных нумарох. Добра яшчэ і тое, што пішаце прозай на тэмы блізкія і добра Вам знаёмыя.

А. ІВЭРС: За вершы дзякуем. Выкарыстаем. Толькі з некаторымі вершамі катастрофа: („На прадвесьні“). Проста жыўцом узятыя з Васілька, з Ільляшэвіча і яшчэ раз з Васілька; або „па голре лебядзей“ — жывы. Есенін. Не радзім фатаграфаваць, бо маеце свой талент.

ЯНКА ЛОСЬ. Пісаць пішэце, але больш апрацоўвайце свае тэмы, хоць-бы дзелятаго, што яны ўжо апрацаваны добрапраз папярэдніх пісьменьнікаў таму ў падобных выпадках мусіце даваць нешта новае, арыгінальнае, сваё каб не рабіла ўсё гэта ўражаньня нейкага перазвону і то горшага гатунку

КІСЕЛЬ ВАСІЛЬ: Вершы да друку яшчэ не надаюцца. А над папраўкай трэба больш працаваць, як над імі працаваў сам аўтар. Старайцеся меньш напісаць, але больш сказаць, больш зьместу ўлажыць у кожнае слова.

К. Х.: Вершы добрыя. Друкуем. Праўда ў некаторых вершах шмат лёзунгаў, пералажаваных, збітых, што вельмі абніжае агульнае ўражаньне. Некаторыя вершы робяць уражаньне зрыфмаванай прозы, як: „Дай руку“... Адзін з лепшых, арыгінальных вершаў гэта „Узьвей вецер“... які на жаль ад незалежных ад рэдакцыі прычын зьмясьціць няможна.

Я. СУМНЫ: Верш апрацаваны добра. толькі ўжо не актуальны, а тэма перарасла тыя параўнаньні ў якія замкнуў яе аўтар

АНАТОЛЬ ДЗІК: Вершы слабыя г. зн. што над імі трэба працаваць больш зьвярніце ўвагу на Ваш верш які друкуем, параўнайце з арыгіналам. Рэдакцыя ня можа перапрацоўваць усе матэр'ялы. Трэба кожнае слова адважыць пакуль напісаць, — каб верш меў вартасьць, ясна праведзяную думку. Зьвярніце ўвагу на мову вершаў, якія друкуюцца. Можна зрыфмаваць усю палітэканомію, але гэта яшчэ ня будзе паэзыяй.

На пытаньні Вашы з пэўных прычын адказу рэдакцыя даць ня можа.

С. ХМАРА: Вершы некаторыя ад незалежных ад нас прычын ня можам зьмясьціць. Вельмі добрая рэч „Засванілі“ якую ў наступным нумары пастараемся выкарыстаць.

ЧАРОМХА: Больш чытайце, а перадусім апануйце мову. Зьвярніце ўвагу на вершы, якія друкуюцца ў „Н. Волі“ і глядзіце адказы другім.

Паштовая скрынка.

Сяўбіту з пад Маладэчна. Мусіце яшчэ шмат папрацаваць. Чытайце чым-больш беларускіх пісьменьнікаў.

Бядзе. Карэспандэнцыя Ваша цікавая, але па прычынам ад нас незалежным зьмясьціць ня можам.

Пакрыўджанаму. З прычын ад нас незалежных карэспандэнцыю зьмясьціць на можам.

Бакачу. Газэту высылаем акуратна, пастарайцеся высьвятліць гэту справу на пошце. Прозьбу Вашу што да дэкляарацьяў перадалі ў школьны сэкрэтар'ят.

Лаврыновічу П. Карэспандэнцыі Вашы будзем ахвотна зьмяшчаць Ацэнку Вашых твораў знайдзеце у наступным нумары газэты.

Моладзі в. Гарны, Гарадзенскага павету. Прозбы вашай па прычынам ад нас незалежным споўніць ня можам.

Лукашэвічу Б., Майсевічу К., Лопату В., Турку С., Жыгалу М., Власаву А., Нестору Ул, Калесьніку К. прозьбу спаўняем.

Якімовічу Я., Галашэўскаму Я, Смуразе Я. газэту высылаем акуратна, пастарайцесь высьвятліць гэту справу на пошце ці у солтыса.

Вёска Выверы—пры карэспандэнцыі павінен быць паданы дакладны адрас таго, каторы яе піша і псэўдонім, якім падпісвае карэспондэнцыю.

Вуху. Карэспандэнцыю Вашу з прычын цэнзурных зьмясьціць ня можам.

Бурстальгому В. За пажаданьні дзякуем. Вершы да друку слабыя. Карэспандэнцыю з прычын ад нас незалежных выкарыстаць ня можам. Пішэце.

Шчырым Беларусам, за прывітаньне дзякуем. Карэспандэнцыю з прычын ад нас незалежных выкарыстаць ня можам.

У. Г. і Р. Б. За карэспандэнцыю дзякуем. Выкарыстоўваем.

Саўку і Работніку. Карэспандэнцыю зьмяшчаем.

Моладзі В.-сяла. За прывітаньне шчыра дзякуем. Спадзяёмся, што неабмежуецеся маральным падтрыманьні часопісу, але і пастараецеся памагчы матэрьяльна.

Тыпмачу. Карэспандэнцыю выкарыстоўваем.

С. Я. За прывітаньне дзякуем.

Адказны Рэдактар і Выдавец ВІНЦЭСЬ СКЛУБОЎСКІ.

Друкарня І. Баеўскага. Вільня, Татарская вул. 13.